## EGZAMIN PISEMNY

Olimpiada Języka Białoruskiego – XXX edycja
Zawody II stopnia (okręgowe)
Hajnówka, 18 stycznia 2024 roku

### I. Устаў “у” або “ў” згодна з беларускім правапісам. (10 балаў)

- Лявон Юрэвіч і Наталля Гардзіенка ўклалі том «Выбранае», **(1)** __ які **(2)** __вайшлі **(3)** __спаміны, працы аб рэлігійнай гісторыі Беларусі і рэфлексіі пра беларускую эміграцыю айца Льва Гарошкі, а таксама тэксты пра аўтара.
- Чацвёртая кніга серыі Клайва Стэйплза Льюіса «Хронікі Нарніі» **(4)** __ перакладзе Яны **(5)** __ладыкі мае выйсці **(6)** __ сярэдзіне снежня.
- Выдавецтва аўдыякніг Litaralna выпусціла аўдыяверсію знакамітага твору Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь **(7)** __ фантастычных апавяданнях». Агучвае кнігу актор Алег Гарбуз. Празаічны зборнік пісаўся Янам Баршчэўскім на польскай мове і першапачаткова быў выдадзены ў 1844—46 гадах **(8)** __ чатырох кнігах. Пераклад, які здзейсніў Мікола Хаўстовіч, **(9)** __першыню быў апублікаваны **(10)** __ 1990 годзе.

### II. Запішы займеннікі з дужак у адпаведнай граматычнай форме. Калі трэба, дадай прыназоўнік. (5 балаў)

**Узор**: кпіць (я) – *з мяне*.

1. давяраць *(ты)* – ____________________________ .
2. ажаніцца (яна) – ____________________________ .
3. клапаціцца (мы) – ___________________________ .
4. дзякаваць *(ён)* – ____________________________ .
5. дакрануцца (яно) – __________________________ .

### III. Дзеясловам у дужках надай форму цяперашняга часу. (10 балаў)

Не лазь на гарышча, — **(1)** ___________________ *(наказваць)* бабуля,— дзіўнае чыніцца там: няма нікога, ды **(2)** ___________________ *(гаварыць)* нейкія людзі, і дзіця **(3)** ___________________ *(плакаць)*, а ўчора,— **(4)** ___________________ *(жагнацца)* яна,— круціўся сам сабою калаўротак.

Дзень навылёт **(5)** ___________________ *(сядзець)* я ціхутка на печы — **(6)** ___________________ *(слухаць)* гарышча: **(7)** ___________________ *(смяяцца)* там дзеці, **(8)** _______________________

*(гігатаць)* прыцішана конь, стоена **(9)** ________________ *(дыхаць)* хтосьці, слухаючы хату або птушак на вільчыку.

Мы **(10)** ________________ *(жыць)* у хаце,
над намі жыве гарышча,
над гарышчам — неба.

*У. Арлоў*

**IV. Замяні прыметнік сінонімам, а назоўнік – антонімам. Запішы новыя словазлучэнні. (10 балаў)**

1. маркотны шэпт – ____________ ____________
2. мажная жанчына – ____________ ____________
3. кволы маладзён – ____________ ____________
4. паны́лая надзея – ____________ ____________
5. сур'ёзны права́л – ____________ ____________

**V. Пустыя месцы ў тэксце запоўні словамі для ўстаўкі ў адпаведнай граматычнай форме. Звярні ўвагу, што адно слова паўтараецца двойчы. (5 балаў)**

**Слоўвы для ўстаўкі:** сапраўдны, праўдзівы, куды, дзе.

У руках хлапчыны быў білет на **(1)** ________________ футбольны матч. Значыць, словы таты былі **(2)** ________________ , значыць, яны пойдуць туды, **(3)** ________________ натоўпы заўзятараў назіраюць за гульнёй **(4)** ________________ футбалістаў, туды, **(5)** ________________ ён ніколі не хадзіў раней.

**VI. Перакладзі на польскую мову. (25 балаў)**

Ну, а што датычыць адкрыццяў, дык засяроджуся на мінулым майго роднага Полацка. Чалавек мусіць імкнуцца ведаць што-небудзь пра ўсё і ўсё пра што-небудзь. Вось я і імкнуся — хоць і ўсведамляю сваю наіўнасць — ведаць усё пра полацкую гісторыю.

Апошнімі гадамі кожны сезон прыносіць больш ці менш значныя адкрыцці археолагам, што ў поўным сэнсе гэтага слова заглыбляюцца ў даўнія стагоддзі патрыярха нашых гарадоў.

Адносна нядаўна Сяргей Тарасаў раскапаў майстэрню старажытнага полацкага ювеліра, дзе знайшоў і тыглі[1], і пінцэты, а сярод іншага прычындалля, калі не памыляюся, ажно некалькі сотняў кавалачкаў ужо адштукаванага[2] і «дзікага» бурштыну.

---

[1] Тыгель – пасудзіна з вогнетрывалага матэрыялу для плаўкі, варкі, нагрэву розных матэрыялаў. Польск. tygiel.

[2] Адштукаваць – прыдаць закончаны выгляд, хораша адстроіць, вырабіць.

Дарэчы, у палачанак эпохі Рагнеды і Еўфрасінні бурштынавыя пацеркі былі вельмі папулярныя не толькі як упрыгожанне. Лічылася, што яны спрыяюць здароўю і найперш выдатна дапамагаюць ад бяссоння. Сучасныя беларускі могуць пераканацца ў гэтым, паклаўшы аздобу сабе пад падушку. А мужчынам, якія, каб заснуць, вымушаныя лічыць бяссоннымі начамі сланоў ці авечак, раю браць кавалак бурштыну неапрацаванага. Сам спрабаваў.

Вярнуўшыся да археолагаў, скажу, што ўжо не першы год уважліва сачу за працаю Дзяніса Дука, даследчыка Полацка з новай генерацыі слуг Кліо. Асабіста я чакаю ад спадара Дзяніса моцных аргументаў для сваёй прапановы афіцыйна зрабіць Полацк на некалькі стагоддзяў старэйшым.

У. Арлоў, *Пакуль ляціць страла,* Радыё свабода 2012, сс. 304–305.